# ПРАТАКОЛ ПАСЯДЖЭННЯ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ

29 красавіка 2024 года

На пасяджэнні камісіі прысутнічаюць: Андрэй Атаманчук, Алена Філатава, Яраслаў Бекіш, Алена Прыходзька, Альвіна Мінгазава, Зміцер Лазавік.

У сілу п. 4.11 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную Раду для прыняцця рашэнняў неабходны кворум павінен складаць 2/3 ад колькасці чальцоў Выбарчай камісіі. Неабходная колькасць сябраў Выбарчай камісіі прысутнічае – 6 чалавек. Кворум выкананы.

Паседжанне Выбарчай камісіі аб'яўляецца адкрытым.

На пасяджэнні Выбарчай камісіі прысутнічаюць сябры Выбарчай камісіі з правам голасу, а таксама сябры сакратарыята Выбарчай камісіі, якія з'яўляюцца непублічнымі асобамі, аказваюць тэхнічную дапамогу Выбарчай камісіі, у тым ліку складаюць пратакол пасяджэння Выбарчай камісіі, аднак правам галасы не валодаюць.

**Парадак дня:**

1. Зацвярджэнне парадка дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 29 красавіка 2024 года.
2. Рашэнне па скарге са спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава”.
3. Рашэнне па скарге Спадарыні Аліны Коўшык.
4. Рашэнне па скарге са спісу “Голас дыяспар. Адзінства па-над межамі” Надзеі Нортан.
5. Рашэнне па скарге ад лідара спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава” наконт лёсавання.

**Разгляд пытання №1.**
Зацвярджэнне парадку дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 29 красавіка 2024 года.
Заўваг ад сяброў выбарчай камісіі не паступіла.
Па пытанні № 1 прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Зацвердзіць парадак дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 29 красавіка 2024 года.

**Разгляд пытання №2.**

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні скаргі аднаго з чальцоў спісу "Блок Пракоф'ева-Ягорава":

"Храналогія падзеяў. Мінулае паседжанне ў нас адбывалася а 12:00 гадзіне і на гэтып пасяджэнні было прынята рашэнне аб выключэнні са спісу "Блок Пракоф'ева-Ягорава" Спадара па прозвішчу Гамолка і гэта рашэнне было прынята на падставе таго, што на той момант у нас не было ніякіх звестак ад Спадара Гамолкі: ні яго асабістага дакумента, не праз верыфікацыйную форму, што б сведчыла, што гэты чалавек надаў сваю асабістую згоду на удзеле ў гэтым спісе і ўдзеле ў выбарах. На падставе адсутнасці гэтых дадзеных, камісія прыняла рашэнне аб выключэнні чалавека са спіса. Пасля таго як пасяджэнне скончылася, ад лідара спіса мы атрымалі запыт, скаргу на тое каб гэтае рашэнне скасаваць на падставе таго, што на той момант Спадар Гамолка паспеў накіраваць да нас свій запыт, але мы не паспелі яго пабачыць і апрацаваць. Мы разглядзелі ўсе абставіны гэтай справы. Мы пабачылі, што асабістыя дадзеныя Спадара Гамолкі былі дасланыя да нас у 11:25, тобок за 35 хвілін да таго як нашае пасяджэнне адбывалася. Мы верыфікавалі Спадара Гамолку.

Гасасаванне за ўключэнне Спадара Гамолку ў спіс "Блок Пракоф'ева-Ягорава" пад нумарам 32, унесці адпаведныя змены ў спіс і зацьвердзіць новы спіс:
Прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Уключыць Спадара Гамолку ў спіс "Блок Пракоф'ева-Ягорава" пад нумарам 32, унесці адпаведныя змены ў спіс і зацьвердзіць новы спіс.

**Разгляд пытання №3.**
СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні скаргі Спадарыні Аліны Коўшык:

"Прапаную дакладна прагаварыць усе абставіны гэтай справы, таму што яна зараз з'яўляецца публічнай. Выбарчая камісія па правядзенню выбараў у Каардынацыйную Раду ў асобах Алены Прыходзькі, Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Змітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай, Алены Філатавай разглядаем на адкрытым пасяджэнні скаргу на рашэнне выбарчай камісіі ад 25 красавіка 2024 года аб выключэнні асобы пад нумарам 2 са спісу кандыдата выбарчага суб'екта "Еўрапейскі выбар". 26 красавіка 2024 года а 16:47 па CET на адрас Выбарчай камісіі паступіла скарга ад заяўніцы Аліны Коўшык. Яна прасіла прызнаць яе скаргу абгрунтаванай і адмяніць рашэнне выбарчай камісіі ад 25 красавіка 2024 года аб выключэнні яе са спісу выбарчага суб'екта "Еўрапейскі выбар" і ўключыць у спіс кандыдатаў выбарчага суб'екта "Еўрапейскі выбар" згодна с пададзенымі на рэгістрацыю дакумэндамі пад

імём Аліна Коўшык. Скарга пададзена ад зацікаўленай асобы, у дачыненні да якой было прынята рашэнне Выбарчай камісіяй. Дакумент накіраваны на канал афіцыйнай камунікацыі ў вызначаны пп. 16.1 тэрмін. Разам з тым, у парушэнне абавязковых патрабаванняў Рэгламента, а менавіта, пп.16.1 а) пункта 16, заяўнік не ўказала сваё імя па-бацьку і кантакт, на каторы накіроўваецца адказ па скарзе. Акрамя таго, указанае заяўніцай прозвішча не адпавядае раней дасланаму ідэнтыфікацыйнаму дакументу, згодна з якім заяўніца мае іншае прозвішча - KOUSHYK-PIETRZYKOWSKA. Абмеркаваўшы хібы дасланай скаргі, Выбарчая камісія прыйшла да высновы, што ў дадзеным выпадку невыкананне заяўнікам патрабаванняў Рэгламента не з’яўляецца істотным, каб пакінуць скаргу без разгляду.

Довады скаргі:
Заяўнік сцвярджае наступнае: “Падставай для выключэння мяне з выбарчага спісу паслужыла тая акалічнасць, што ў самім спісе мае анкетныя дадзеныя пазначаны як “Аліна Коўшык”, а прадстаўленыя дакументы, якія пацвярджаюць асобу, утрымлівалі ў сабе падвойнае прозвішча, другая частка якога - прозвішча майго былога мужа”. Заяўнік сцвярджае, што па просьбе Выбарчай камісіі былі дадзены падрабязныя тлумачэнні аб прычынах указання дзявочага прозвішча ў спісе кандыдатаў, “якое адпавядае існуючаму”. Заяўнік сцвярджае, што выбарчы спіс “утрымоўвае судовае рашэнне аб скасаванні шлюбу ад 8 студзеня 2024 года”. Заяўнік сцвярджае, што з’яўляецца вядомай і медыйнай асобай, у сувязі з чым пазначана ў спісе пад нумарам 2. Патэнцыйныя выбаршчыкі яе ведаюць пад іменем “Аліна Коўшык”. Да цяперашняга часу заяўнік не змяніла прозвішча, паколькі працэдура змянення анкетных дадзеных у польскіх дакументах патрабуе значнага часу. Заяўнік сцвярджае, што патрабаванні пп. 5.1 пункта 5 Палажэння цалкам выкананы ў дачыненні да яе. Заяўнік сцвярджае, што Палажэнне і рэгламент не ўтрымліваюць жорсткіх патрабаванняў указваць дадзеныя кандыдата ў адпаведнасці з дакументамі. Заяўнік сцвярджае, што ўказанне яе сапраўднага прозвішча можа ўвесці ў зман выбаршчыкаў. Заяўнік сцвярджае, што дзеянні Выбарчай камісіі парушаюць права на імя, што з’яўляецца ўмяшаннем ў асабістае жыццё і парушае артыкул 17 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. Заяўнік адзначае, што абмежаванні яе правоў павінна быць скіравана на прадухіленне пагроз бяспецы і здароўю насельніцтва. Заяўнік сцвярджае, што рашэнне Выбарчай камісіі неправамернае, бо ягонай падставай паслужыла “нежаданне ствараць прэцэдэнт”, што нелегітымна, паколькі супярэчыць “імкненню Беларусі і беларусаў да пабудовы дэмакратычнага грамадства і прынцыпам і асновам міжнароднага права”.

Разгледзіўшы і абмеркаваўшы довады скаргі, Выбарчая камісія прыходзіць да наступных высноваў:

Камісія не пагаджаецца з довадам заяўніка наконт падставы прынятага рашэння. Як было агучана падчас пасяджэння Выбарчай камісіі, падставай для выключэння са спісу стала невыкананне фармальных патрабаванняў: прозвішча, указанае ў спісе кандыдатаў адрознівалася ад прозвішча паводле ідэнтыфікацыйнага дакумента. 22 красавіка 2024 года ў Выбарчую камісію паступіла заяўка на рэгістрацыю выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” ад Аляксандра Дабравольскага. Сярод кандыдатаў у спісе была адзначана “Аліна Коўшык”.  У той жа дзень ініцыятару спіса быў дадзены адказ аб прыёме заяўкі, у якім паведамлялася, што па выніку апрацоўкі заяўкі будзе дасланы верыфікацыйны код, пасля чаго цягам 48 гадзін будзе праводзіцца верыфікацыя кожнага чальца выбарчага спісу. 23 красавіка 2024 года у 11 гадзін 10 хвілін (CET) па выніку апрацоўкі Сакратарыятам Выбарчай камісіі пададзенай заяўкі, на адрас лідара спіса Аляксандра Дабравольскага паступіў код індывідуальнага ідэнтыфікатару выбарчага спіса. У лісце таксама ўтрымлівалася спасылка на форму рэгістрацыі для кандыдатаў выбарчага спісу і просьба прайсці верыфікацыю цягам 48 гадзін. У форме верыфікацыі чальца выбарчага спіса ўказваўся апошні тэрмін падачы заявак - 25 красавіка 2024 года 11:04 па мінскім часе (12:04 па CET). 23 красавіка 2024 года паступіла заяўка ад імені Аліны Коўшык, да якой быў далучаны ідэнтыфікацыйны дакумент - пашпарт Рэспублікі Беларусь на іншае імя. 24 красавіка 2024 года на адрас лідара спісу выбарчага суб’екта Аляксандра Дабравольскага быў накіраваны ліст, у якім утрымліваўся просьба падаць у Выбарчую камісію наступныя дадзеныя пра заяўніка: імя і прозвішча кандыдата згодна з дакументам, які ідэнтыфікуе грамадзянства Рэспублікі Беларусь; імя і прозвішча кандыдата, якое яна жадае ўказаць у спісе кандыдатаў побач з указаным у п.1; абгрунтаванне неабходнасці ўказання ў спісе выбарчага суб’екта імя і прозвішча, якое адрозніваецца ад указанага ў п.1. У 24:00 (CET) ініцыятар выбарчага спісу адказаў на электронны адрас Выбарчай камісіі, што заяўнік гатовая “прадставіць усе дакументы і тлумачэнні”. 25 красавіка 2024 года а 12-й гадзіне (па CET) пачалося адкрытае пасяджэнне Выбарчай камісіі, на якім было агучана рашэнне па рэгістрацыі і далейшым удзеле 12-ці выбарчых спісаў (у тым ліку “Еўрапейскі выбар”). Да пачатку пасяджэння ў Выбарчую камісію так і не паступілі наступныя звесткі ад заяўніка:

1) напісанне імя і прозвішча (згодна з пашпартам),
2) напісанне імя і прозвішча (якое заяўнік жадае ўказаць у спісе кандыдатаў),
3) абгрунтаванне.

Такім чынам, Выбарчая камісія не мела дастатковых дадзеных, якія дазваляюць зацвердзіць кандыдатуру заяўніка ў выбарчым спісе і, адпаведна,

было прынятае рашэнне аб выключэнні са спісу кандыдатаў. На пасяджэнні Выбарчай камісіі 25 красавіка 2024 года быў агучаны агульны падыход для ўсіх кандыдатаў: указваецца імя і прозвішча, якое асоба хоча адлюстраваць у спісе выбарчага суб’екта, побач з імем і прозвішчам паводле ідэнтыфікацыйнага дакумента. Дадзены падыход абумоўлены правам выбаршчыкаў на атрыманне інфармацыі пра кандыдатаў і спецыфікай працэдуры праходжання верыфікацыі, якая патрабуе супастаўленне і праверку дадзеных, указаных у заяўцы і ў дакументах. Камісія не пагаджаецца з довадам заяўніка аб тым, што пазначанае ёй у заяўцы прозвішча “адпавядае “існуючаму”. Гэта абвяргаецца як ідэнтыфікацыйным дакументам, згодна з каторым заяўнік мае іншае прозвішча, так і зместам скаргі, паводле якога заяўнік на дадзены час не змяніла прозвішча. Што тычыцца довады заяўніка аб просьбе Выбарчай камісіі да заяўніка даць тлумачэнні, Камісія сапраўды пагаджаецца з гэтым сцвярджэннем: як адзначалася вышэй, ад заяўніка патрабавалася ўказаць напісанне свайго імя і прозвішча паводле ідэнтыфікацыйнага дакумента, жаданае імя і прозвішча, а таксама абгрунтаванне (тлумачэнне) неабходнасці ўнясення ў спіс кандыдатаў прозвішча, якое адрозніваецца ад пашпартнага. Аднак гэтыя звесткі не былі дасланы да пачатку пасяджэння. Выбарчая камісія не мае паўнамоцтваў самастойна ўносіць імя і прозвішча кандыдата ў спіс выбарчага суб’екта з прычыны наступнага: у адпаведнасці з Палажэннем гэтыя дзеянні павінны выконвацца ініцыятарам спісу і кандыдатам спісу; Выбарчая камісія надзелена правам толькі верыфікацыі - супастаўлення імя і прозвішча асобы з імем і прозвішчам, указаным у ідэнтыфікацыйным дакуменце; адказнасць за правільнасць напісання імя і прозвішча кандыдатаў нясуць ініцыятар спісу выбарчага суб’екта і кандыдат; прозвішча заяўніка паводле ідэнтыфікацыйнага дакумента мае некалькі варыянтаў напісання (транслітарацыі); заяўнік адмаўляецца ўказваць сваё прозвішча паводле ідэнтыфікацыйнага дакумента ў спісе кандыдатаў выбарчага суб’екта. Выбарчая камісія не пагаджаецца з довадам заяўніка аб тым, што выбарчы спіс змяшчае судовае рашэнне аб скасаванні шлюбу. Выбарчы спіс такіх дакументаў не прадугледжвае (ў тым ліку судовае рашэнне, на якое спасылаецца заяўнік). Спіс кандыдатаў выбарчага суб’екта змяшчае толькі пералік кандыдатаў і іх анкетныя дадзеныя: імя і прозвішча згодна з дакументамі, якія ідэнтыфікуюць асобу і пацвярджаюць наяўнасць беларускага грамадзянства, а таксама (па жаданні) імя і прозвішча, якое кандыдат хоча ўказаць дадаткова. Што тычыцца самога дакумента (судовага рашэння), ён быў дасланы ў Выбарчую камісію ў 12:05 (CET) пасля пачатку яе пасяджэння, з прычыны чаго не з’яўляўся прадметам даследавання і не мог паўплываць на прынятае рашэнне. Пасля правядзення пасяджэння Выбарчая камісія прааналізавала дакумент: ён дасланы ў электронным выглядзе на польскай мове без рэквізітаў (адсутнічалі пячатка, подпіс і інш.). У ім фігуруе

прозвішча якое пазначана ў пашпарце, але якое не адпавядае прозвішчу, якое пазначана ў спісе. Выбарчая камісія прыходзіць да высновы, што дадзены дакумент пацвярджае наяўнасць у заяўніка прозвішча, якое адрозніваецца ад указанага ў заяўцы. Довад заяўніка пра тое, што патэнцыйныя выбаршчыкі ведаюць яе пад прозвішчам "Коўшык" прыняты Выбарчай камісіяй як абгрунтаванне неабходнасці ўказваць яго ў спісе кандыдатаў побач з сапраўдным прозвішчам. Але дадзеная аргументацыя адсутнічала на момант правядзення пасяджэння Выбарчай камісіі 25 красавіка 2024 года і, адпаведна, не магла быць улічана. Што тычыцца доваду заяўніка пра тое, што змена прозвішча "патрабуе значнага часу", Выбарчая камісія не лічыць такі аргумент пераканаўчым для адмены прынятага рашэння. Выбарчая камісія не пагаджаецца з тым, што ў дачыненні да заяўніка выкананы патрабаванні пп. 5.1 п.5 Палажэння. Згодна з дадзеным падпунктам копіі дасланых дакументаў павінны пацвярджаць асобу кандыдата. Імя асобы, пазначанай у спісе кандыдатаў пад іменем "Аліна Коўшык" не супадала з анкетнымі дадзенымі, указанымі ў пашпарце, з прычыны чаго Выбарчая камісія прыйшла да высновы аб неабходнасці правядзення поўнай верыфікацыі ў дачыненні да заяўніка і высветліць прычыны несупадзення дадзеных спісу і дакумента. Па выніку высвятлення абставінаў Выбарчая камісія так і не атрымала адпаведных звестак, якія патрабаваліся ад іншых кандыдатаў у аналагічных сітуацыях (напісанне імя і прозвішча згодна з дакументам, жаданае для ўказання імя і прозвішча, абгрунтаванне). Выбарчая камісія пагаджаецца з довадам заяўніка пра тое, што Палажэнне і Рэгламент не ўтрымліваюць патрабаванняў да спісаў кандыдатаў, прычым, не толькі жорсткіх, але і ўвогуле не прадугледжаны шэраг працэдурных пытанняў. З гэтай прычыны, у адпаведнасці з пп. 4.9.3. пункта 4 Палажэння Выбарчая камісія надзелена кампетэнцыяй па распрацоўцы ўласных правіл і працэдур. Агульны падыход да афармлення спісаў кандыдатаў вынікаў з дасланага ў бок ініцыятара спісу ліста і агучаны публічна 25 красавіка 2024 года на пасяджэнні. Выбарчая камісія адзначае, што рашэнне аб выключэнні кандыдата са спісу выбарчага суб'екта можа быць адменена ў любы момант да пачатку галасавання пры ўмове выканання працэдуры верыфікацыі. Выбарчая камісія не пагаджаецца з довадам заяўніка аб тым, што ўказанне яе сапраўднага прозвішча ўводзіць у зман патэнцыйных выбаршчыкаў. Згодна з Палажэннем выбарчы працэс ажыццяўляецца на аснове празрыстасці, што, па меркаванні Выбарчай камісіі, азначае права выбаршчыка ведаць сапраўдныя імёны і прозвішчы асобаў, за якіх яны аддаюць галасы. Указанне пашпартных дадзеных у спіс кандыдатаў з'яўляецца агульнай практыкай вядзення дэмакратычнага выбарчага працэсу ў краінах свету і адпавядае агульнапрызнаным прынцыпам правядзення дэмакратычных выбараў. Што тычыцца доваду заяўніка аб тым, што апублікаванне сапраўднага прозвішча з'яўляецца ўмяшаннем у прыватнае жыццё і парушае права, прадугледжанае артыкулам 17 Міжнароднага пакта аб

грамадзянскіх і палітычных правах, Камісія адзначае наступнае. Сапраўднае прозвішча кандыдата не апублікавана і не будзе апубікавана да моманту атрымання на гэта згоды. Што тычыцца патрабавання ўказаць яго ў спісе кандыдатаў, Камісія не лічыць гэта парушэннем права на ўласнае жыццё, як і на ажыццяўленне палітычнай дзейнасці. Публічная асоба апрыёры карыстаецца меншым узроўнем абароны ад умяшання ў асабістае, сямейнае жыццё, ад разгалашэння іншай (нават канфідэнцыяльнай) інфармацыі аб ёй. Такі стан рэчаў тлумачыцца роляй і месцам, якое займае вышэйзгаданая асоба ў грамадскім жыцці краіны. Згодна з пунктам 6 Рэзалюцыі ПАСЕ №1165 (1998) аб праве на недатыкальнасць асабістага жыцця, "публічныя фігуры павінны прызнаць тую акалічнасць, што асаблівае становішча, якое яны, часта па ўласным выбары, займаюць у грамадстве, аўтаматычна вядзе да ўзмацнення ціску грамадскасці ў дачыненні да іх асабістага жыцця". У адпаведнасці з пунктам 9 "пэўныя факты з прыватнага жыцця публічных, і, у прыватнасці, палітычных дзеячаў, вядома ж, могуць мець цікавасць для грамадзян і, такім чынам, чытачы, якія таксама з'яўляюцца і выбаршчыкамі, маюць права быць у курсе аб такіх фактах". Такім чынам, Выбарчая камісія не бачыць парушэння ў патрабаваннях да палітыка давесці да выбаршчыкаў інфармацыю пра сваё сапраўднае прозвішча. Насуперак доваду заяўніка Выбарчая камісія не лічыць, што сваімі дзеяннямі стварае небяспеку для насельніцтва, як і ягонаму здароўю. Прынамсі, ад заяўніка не паступала просьбы не ўказваць яе сапраўднае прозвішча, матываванай клопатам пра здароўе насельніцтва і ягоную бяспеку. Выбарчая камісія не пагаджаецца з довадам заяўніка аб падставе прынятага рашэння, паколькі ён супярэчыць фактычным абставінам. "Мэта не ствараць прэцэдэнт" - не з'яўлялася падставай для рашэння Камісіі. Рашэнне было прынятае на падставе невыканання патрабаванняў для спісу выбарчага суб'екта і праходжання працэдуры верыфікацыі. Гэтыя патрабаванні аднолькавыя для ўсіх і выконваліся ўсімі кандыдатамі, акрамя заяўніка. Што тычыцца доваду аб парушэнні міжнароднага права, заяўнік не ўказала, якія канкрэтныя нормы былі парушаны, што не дазваляе належна разгледзіць гэтае пытанне."

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні скаргі Спадарыні Аліны Коўшык:

"Гэтая сітуацыя стварыла шмат публічных ям. Некаторыя з іх, спраба выкарыстаць "тэлефоннае права", спроба ў публічнай прасторы ад іншых публічных людзей звярнуцца да Выбарчай камісіі ці да сябраў Выбарчай камісіі з просьбай нешта патлумачыць, з пробамі неяк паўплываць на рашэнне і так далей. Я хацеў бы прапрасіць учіх: і грамадства і выбарчыя суб'екты, каб гэтыя спробы не былі такімі інтэнсіўнымі. У нас ёсць спробы ціску з абодвух бакоў. Мы не будзем дзейнічаць, таму што хтосьці на нас звяртаецца. Нас

стварыла Каардынацыйная Рада. Яна можа нас распусціць. Нават Каардынацыйная Рада не можа ўплываць на нашыя рашэнні. Асабістых тлумачэнняў у нас не будзе. Мы ўсё тлумачым публічна. Ёсць дакуманты. Ёсць паседжанні, ёсць відеазапісы. Звяртаюся да Аліны Коўшык асабіста. Можна звярнуцца да Выбарчай камісcіі з просьбай вярнуць яе ў спіс і пазначыць яе сапраўднае імя і ў дужках імя пад якім яе ведаюць выбаршчыкі, такім чынам як гэта робіцца ў выпадку іншых публічных асобаў.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Алену Філатаву па пытанні скаргі Спадарыні Аліны Коўшык:

“Відавочна, што на нас спрабуюць ціснуць рознымі спосабамі. Па-першае, гэта ня ёсць вырашэнне пытання. Па-другое, калі прааналізаваць усе паседжанні, якія мы публічна праводзім, мы заўсёда абапіраемся на дакумэнты, на Палажэнне, якое рэгламентуе нашу працу. Мы заўсёды абгрунтавана падаем інфармацыю чаму было прынята тое ці іншае рашэнне. У сваіх рашэннях мы не кіруемся эмоцыямі, альбо асабістым стаўленнем да асобы. Гэта тычыцца кожнага чальца Выбарчай камісіі. Выбарчая камісія ў гэтым складзе – гэта прэцыдэнт для Рэспублікі Беларусь. Вось такія празрыстыя выбары мы бачым упершыню. Тая адказнасць, якая ляжыць на Выбарчай камісіі сёння, гэта ўплыне на наша далейшае жыццё.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Альвіну Мінгазаву па пытанні скаргі Спадарыні Аліны Коўшык:

“Выбарчая камісія - фармалісцкі орган. Верыфікацыя асоб са спіса ажыццяўляецца шляхам зверкі пэўных дадзеных. Калі гэтыя дадзеныя не супадаюць, значыць, Выбарчая камісія можа запытваць пэўныя дакументы. У кожнага можа быць свой нейкі асабісты чыннік. Фармальна, рашэнне аб скасаванні шлюбу, якое не ўключае ў сябе звестку аб змене прозвішча і адсутнічае любы іншы дакумент, які сведчыць аб тым, што прозвішча было зменена - для Камісіі гэта несупадзенне асабістых дадзеных у спісе і дакуменце, які сведчыць асобу. Камісія дзейнічае зыходзячы з тых дакументаў, якія ёсць зараз. Жадаю адзначыць, што ў такой сітуацыі, калі немагчыма памяняць дакументы знаходзяцца ўсе ўдзельнікі выбарчага працэсу. Калі Камісія зробіць выключэнне для аднаго чалавека, то гэта будзе дыскрымінацыяй у адносінах да іншых.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Зміцера Лазавіка па пытанні скаргі Спадарыні Аліны Коўшык:

“Цяперашняя выбарчая кампанія праводзіцца са значнымі спрашчэннямі і дапушчэннямі. Мы не патрабуем ад кандыдатаў не дэкларацыі аб маёмасці і даходах, не звесткі аб складзе сям’і, не іншых дадзеных. І у сувязі з гэтым, давайце, не будзем дапускаць маніпулявання асабістымі дадзенымі кандыдатаў, якія могуць увесці выбаршчыкаў у падман.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Андрэя Атаманчука па пытанні скаргі Спадарыні Аліны Коўшык:

“Я лічу, што рашэньне адпавядае справядлівасьці.»

Гасасаванне за тое, каб пакінуць рашэнне Выбарчай камісіі ад 25 красавіка 2024 года аб выключэнні Спадарыні Аліны Коўшык са спісу выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” у сіле.
Прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Пакінуць рашэнне Выбарчай камісіі ад 25 красавіка 2024 года аб выключэнні Спадарыні Аліны Коўшык са спісу выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” у сіле.

**Разгляд пытання №4.**
СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні скаргі Спадарыні Надзеі Нортан:

“Так сама да нас паступіла скарга ад адной з удзельніц спісаў. Ад лідаркі спіса ад «Голас дыяспар — Адзінства па над межамі» Надзеі Нортан. Яна ў сваёй скарзе ўказала наступнае. “Вітаю, шаноўная выбарчая каміссія! Падаю скаргу, на тое што без майго дазволу на сайце Каардынацыйнай Рады ў спісе выбарчых суб’ектаў было пазначана яе дзівочае прозьвішча.” І так сама яна ўказала сваё імя і прозьвішча якое згодна з пашпартам і прозьвішча, якое яна б хацела адлюстраваць у спісе, то бок якое яна мае ў шлюбе з грамадзянінам іншай краіны. Гэтая скарга можа дзесці часткова тоесная сітуацыя, часткова не. Але прозьвішча спадарыні Нортан зараз у спісе выглядае так, што напісана Надзея Нортан і ў дужках напісана яе прозьвішча якое адпавядае таму, што пазначана ў беларускім пашпарце. І тут, калі ласка выказвайцеся, каллегі. Што ў скарзе напісана, што мы без дазволу па сутнасці чалавека гэта зрабілі. Тут я магу сказаць, што як жа мы без дазволу зрабілі, калі да нас былі дасланыя дакументы? Па-першае, гэта было пазначана ў самім спісе, які быў пададзены лідарам спіса. І складзены ім. То бок мы не самі туды гэтае прозьвішча ўвогуле прыпісвалі. Па-другое сама спадарыня Надзея Нортан да нас дасылала верыфікацыйныя дакументы, яна пазначала ў косачках, што гэта яе прозьвішча дзявочае. Тым не менш, яно адпавядае менавіта таму дакументу, у якім мы

спраўдзілі яе асобу. І,вось дадзеная скарга. Разглядайце, калі ласка, выказвайцеся. А! Так сама важная акалічнасць. Яшчэ ў сваем лісце папярэднім да нас Надзея Норртан указвала, што пазначэнне гэтага прозьвішча можа быць небяспечным для яе і яе родных. Вось такая яшчэ акалічнасць. Дададзена да аргументаў, чаму мы павінны зараз гэтае прозьвішча змяніць.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Алену Філатаву па пытанні скаргі Спадарыні Надзеі Нортан:

“Я, менавіта вазьму слова. Зноўку я буду абапірацца на Палажэнне, на крытэрыі верыфікацыі з якімі мы працавалі. Гэта тычыцца яе асабістага жыцця, вось гэта змены, перамены прозьвішчаў. Мы кіруемся беларускім дакументам. Для нас самы галоўны ідэнтыфікацыйны маркёр быў - наяўнасць беларускага грамадзянства і любы дакумент, якой можа падцвердзіць, альбо скасаваць гэтае палажэнне. Адпаведна, калі мы разглядаем на этапе верыфікацыі асобу, мы павінны сверыць дадзеныя асобы па дакуменце, якой у нас ёсць на руках. Адпаведна, калі мы кажам пра выбары ў іншай краіне і наяўнасць грамадзяніна іншай краіны. Гэта адна справа. Калі мы кажам пра выбары ў беларускую структуру. Мы кіруемся беларускім пашпартам. Адпаведна, зноўку гэта і на гэтым ужо палягала Алена, нашая Старшыня. Што мы не можам уводзіць людзей у падман, зменьваючы прозьвішчы, альбо прыхоўваючы асобу з уласнага пункту гледжання. То бок, тут Палажэнне нас абавязвае аб тым, што мы мусім падаць дадзеныя згодна якіх мы ідэнтыфікавалі асобу. Гэта пашпарт грамадзяніна Беларусі, з наяўнасццю грамадзянства Рэспублікі Беларусь, і з узростам больш за 18 год. Адпаведна, я не бачу нейкай асабістай праблемы. Тым больш, што калі мы кранемся пытання бяспекі выявяцца вельмі непрыемныя рэчы, і я бы не хацела іх зараз агучваць у прамым эфіры. Але тым не менш ў мяне выклікае гэта некаторыя сумневы. Адпаведна, тую форму ў якой мы падалі яе ў спісе я лічу яе адзіна карэктнай. Зменьваць на сённяшні дзень рашэнне, абгрунтаванняў і падставаў я не бачу. Дзякуй!”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Альвіну Мінгазаву па пытанні скаргі Спадарыні Надзеі Нортан:

“Я пагаджуся з Аленай. Хачу дадаць, у сваю чаргу, удзел у выбарах. Мы зыходзім з таго, што кожны суб'ект, член спісу аддае справаздачу ў тым, што ён робіць. І перад падачай дакументаў узважыў усё за і супраць удзелу ў выбарах, таму што з пункту гледжання юрысдыкцыі Беларусі гэта можа пацягнуць за сабой пэўныя наступствы. І ў гэтым моманце, з улікам таго, што неабходна было пры падачы заяўкі ставіць пэўныя галачкі, згоду аб тым, што дакументы будуць перададзены і, што ў Палажэнні чалавек азнаёміўся з

Палажэннем, у якім указана публічнасць. Што чалавек усведамляў і даваў сабе справаздачу ў тым ліку, думаючы аб сваіх сваяках. І ў мяне ўзнікае пытанне. На сённяшні дзень, калі спісы, ужо як некалькі дзён, апублікаваны якое-небудзь рашэнне "за" або "супраць" ці паўплывае на сітуацыю бяспекі? У мяне выклікае сумневы, таму што, дадзеныя спісы ўжо апублічаны. Апублікаваныя паводле тых нормаў і рэгламентаў і, адпаведна, спісы як Старшыня спадарыня наша ўказала аб тым, што яны складаліся не Выбарчай камісіяй, а самім суб'ектам.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні скаргі Спадарыні Надзеі Нортан:

“Мне падаецца, гэтае пытанне мы можам падзяліць на два. Першае. Ці мы сапраўды памыліліся, альбо зрабілі нешта, што не павінны былі рабіць? А другое, што зараз з гэтым рабіць? Першае, спадарыня Надзея кажа, што мы без яе дазволу выкарысталі імя. Я тут згодзен з аргументацыяй якая ўжо прагучала. Мы не выкарыстоўвалі імёны, якія нам не падаваліся. Спачуваю ўсім нашым заяўнікам і заяўніцам, якія апынуліся ў такой сітуацыі, але гэта не камісія падавала спісы. Мы іх правяралі, мы іх узгаднялі, мы іх публікавалі, але складалі не мы. Калі мы з гэтым згодны, мы можам пераходзіць да другой часткі. Што з гэтым рабіць? І тут, як Альвіна сказала толькі што, яны ўжо апублікаваныя некаторы час і мы не атматаем гэта назад, нават калі гэта б мы памыліліся, то ўсё роўна ў нас няма такой магчымасці. Таму я бы прапанаваў так сама звярнуцца да спадарыні Надзеі з запытам, што яна лічыць зараз? Бо, калі яна кажа пра бяспеку гэта не нашая праца сцвярджаць ці гэта бяспечна, ці не. Але я думаю, што мы маглі бы з ёй узгадніць, што яна мае права адклікаць сваё прозьвішча з гэтага ліста, альбо яшчэ нешта прапанаваць. Я бы звярнуўся да яе з запытам аб тым як яна бачыць зараз. Выйсці? Бо, што з свайго боку мы можам зрабіць? Я не разумею. Скасаваць сваё рашэнне, ці якія ў нас ёсць яшчэ магчымасці зараз? Дзякуй!”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Зьмітра Лазавіка па пытанні скаргі Спадарыні Надзеі Нортан:

“Так! Я прапаную рашэннеі камісіі пакінуць у сіле. Адпаведна, у задавленні скаргі адмовіць і буду за гэта галасаваць. А камунікацыю, як прапанаваў шаноўны калега Яраслаў, будзем працягваць. Будзем шукаць кропкі сутыкнення і паразумення.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні скаргі Спадарыні Надзеі Нортан:

“Я прашу прабачэння, яшчэ раз, калегі. Можа я разгубіўся, але скарга ёсць скарга. Але ці можна вас, спадарыня Старшыня папрасіць яшчэ раз нагадаць, што ў гэтай скарзе з’яўляецца прапановай, ці просьбай да нас?”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні скаргі Спадарыні Надзеі Нортан:

“Зварот ад спадарыні Нортан, утрымліваў просьбу па меркаваннях бяспекі прыбраць са спісу кандыдатаў яе дзявочае прозьвішча. Па сутнасці вось у гэтым была просьба. Ну і па-першае з мэтамі бяспекі і па-другое вынікала, што мы без яе дазволу гэта зрабілі. Але, як мы тут ужо абмеркавалі. Мы нічога не рабілі без дазволу і самі нічога не прыдумвалі і гэта прозьвішча было напісана першапачаткова. Па – першае. Што тычыцца гэтых момантаў.  Па-другое, я нагадаю спадарства ўсім нам, што Каардынацыйная Рада афіцыйна з’яўляецца прызнаным беларускім рэжымам экстрымісцкім фармаваннем. Мне падаецца, калі чалавек свядома ідзе ў дэлегаты экстрымісцкага фарміравання, то падбаць пра сваю бяспку, бяспеку сваіх родных гэта справа самаго выбарчага суб’екта, лідараў спісаў якія павінны гэта даводзіць да сваіх людзей і кожнага чалавека ўласна. Таму, што гэта і пра свядомасць, і пра адказнасць, і пра магчымасць пралічыць свае рызыкі. І пра тое, як чалавек будзе працаваць у Каардынацыйнай Радзе. Ён павінен гэта так сама ўтрымліваць. Тут можа яшчэ быць такі момант, што тычыцца таго, што ўмоўна кажучы, беларускія спецслужбы не ведалі гэтага прозьвішча, ну то мне тут так сама трошкі будзе дзіўна. Вы сур’ёзна лічыце, што яны не велаюць нашых прозьвішчаў? І нічога пра нас? То бок для іх гэта будзе нейкім інсайдам? Ці што? Гэта  такая ўжо ад мяне рэмарка, менавіта вось пра тое, калі мы туі з вамі разважаем. Пра ўсі тыя аргументы якія прагучалі.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Альвіну Мінгазаву па пытанні скаргі Спадарыні Надзеі Нортан:

“Я б яшчэ хацела нагадаць, што мы ўсё ж такі дзейнічаем у юрысдыкцыі беларускага права. І таму дакумент…прозвішча гэтае было пазначана таму, што яно пазначана непасрэдна ў беларускім пашпарце і намі таксама было ўстаноўлена, што дастаткова на працягу доўгага часу, не год, не два, не пяць, прозвішча гэтае не было зменена. Таму зноў жа. Для верыфікацыі мы проста абавязаны ўказваць тое прозвішча, якое пазначана ў беларускім дакуменце. Бо для Беларусі гэты чалавек існуе менавіта пад гэтым прозвішчам.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Андрэя Атаманчука па пытанні скаргі Спадарыні Надзеі Нортан:

“Я падтрымліваю калегаў. Лічу падставаў ніякіх няма для адмены рашэння, таму прапаную пакінуць у сіле.”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні скаргі Спадарыні Надзеі Нортан:

“Я так сама згодна, што не бачу ніякіх падставаў і адзінае, што мы можам прапанаваць, мне падаецца, у даным выпадку. Калі, насамрэч, чалавек лічыць што для яго гэта небяспечна, то ён заўжды можа зняць сваю кандыдатуру, выдаліцца з выбарчых спісаў і тым самым закрыць пытанне з асабістай бяспекай у тых умовах. Дарэчы, да таго, што сказаў Яраслаў. А, што мы можам зрабіць зараз калі сітуацыя вось такая? Толькі такі варыянт. Таму давайце яшчэ раз. Можа я трошачкі прапусціла галасуем за тое каб пакінуць скаргу без задавальнення, альбо задавальніць скаргу. Галасуем, калі ласка.”

Гасасаванне за тое, каб пакінуць скаргу Надзеі Нортан без задавальнення, рашэнне Выбарчай камісіі пакінуць у сіле.
Прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Пакінуць скаргу Надзеі Нортан без задавальнення, рашэнне Выбарчай камісіі пакінуць у сіле.

**Разгляд пытання №5.**
СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні скаргі ад лідара спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава” наконт лёсавання:

“Мы пераходзім да разгляду апошняга пытання. Яно тычыцца інцыдэнту, якой адбыўся пад час лёсавання – прызначэнне спісам іх парадкавых нумароў і тут я папрашу выказацца Зміцера Лазавіка, які непасрэдна гэтае лёсаванне праводзіў. Нагадаю, што да нас звярнуліся з просьбай перагледзіць вынікі гэтага лёсавання. Таму, што там адбылася тэхнічная памылка. Зміцер, калі ласка.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Зьмітра Лазавіка па пытанні скаргі ад лідара спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава” наконт лёсавання:

“Коратка, пастараюся вельмі коратка ўсё расказаць. Як адбывалася. Напярэдадні, на працягу некалькіх тэстаў нам чат GPT даваў тыя вынікі, якія былі нам патрэбныя, а менавіта на супраць назвы кожнага выбарчага суб’екту ставіў нумары ў адвольным, ці ў лёсавым парадку. Нажаль, пад час простага этэру, пад час трансляцыі гэта не адбылося.То бок чат GPT не даў нам той вынік, якой мы чакалі. Таму я ў надзеі, што з другой спробы ён дасць нейкі

іншы вынік націснуў яшчэ раз. Гэта адбылося, мы ўважліва пераглядалі трансляцыю, гэта адбылося на працягу там адной секунды. Відавочна, што я нават гэтыя лічбы не паспеў супаставіць і таму я прапаную наступнае. Я прапаную тыя нумары, якія мы прысвоілі выбарчым суб’ектам пакінуць у сіле, лічыць гэтую памылку элементам лёсавання. І ў падтрымку сваёй гэтай пазіцыі хацеў бы яшчэ дадаць, што правядзенне новага лёсавання, альбо выкарыстанне папярэдніх вынікаў яно прывядзе да яшчэ большых пытанняў. І ўскосна я бачу, што астатнія выбарчыя суб’екты з гэтым пагадзіліся. Таму, што скарга з гэтага поваду была толькі адна.”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні скаргі ад лідара спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава” наконт лёсавання:

“Адна. Ад блока Пракоп'ева – Ягорава.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Зьмітра Лазавіка па пытанні скаргі ад лідара спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава” наконт лёсавання:

“Так. Таму буду ўсім ўдзячны за паразуменне і прашу выбарчую камісію пакінуць нашыя зацьверджаныя нумары на даныя ў лёсавым, у адвольным парадку. За гэтае сумленне маё чыстае. Тут я адсоткава ўпэўнены, што я нікому там не намагаўся зрабіць лепшыя ўмовы. Таму прашу пакінуць скаргу без задавалення і рашэнне ў сіле. І, менавіта за гэта буду галасаваць. У мяне ўсё. Дзякуй!”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні скаргі ад лідара спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава” наконт лёсавання:

“Можна, Зміцер толькі папрасіць патлумачыць. Я проста не быў, не ўдзельнічаў, калі праводзілі тэст. Так сказалі, што пад час лёсавання мы атрымалі не тыя вынікі, якіх чакалі. Наколькі я разумею лёсаванне перадугледжвае, што мы не чакаем іншых вынікаў, акрамя рандомных нумароў. Што вы мелі на ўвазе?”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Зьмітра Лазавіка па пытанні скаргі ад лідара спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава” наконт лёсавання:

“Слушная заўвага! Добра. Яраслаў, зараз патлумачу. Калі мы рабілі тэставае лёсаванне, я закідваў гэты промт у чат GPT і прасіў яго, каб ён надаў кожнаму... кожнай назве ў двукоссі адвольны нумар ад 1 да 12. І ён так у слупок і пісаў, назва суб’екту нумар. Наадварот, нумар крапка назва суб’екту. Нумар крапка назва суб’екту. І гэта сапраўды нумары гэтыя прысвойваліся ў

адвольным парадку. Мы гэта неаднаразова правяралі. А пад час трансляцыі чат GPT проста раставіў лічбы ад 1 да 12 проста раставіў у праізвольным парадку, таму я ўзяў на сябе адказнасць.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні скаргі ад лідара спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава” наконт лёсавання:

“Добра. Дзякуй за гэтае тлумачэнне. І думаю, што лёсаванне прайшло, як лёсаванне. І, так, з гэтым могуць быць незгодныя прадстаўнікі спісу якія першы раз мяркуць, што яны былі нумарам першым, але гэтыя вынікі ўжо так сама апублікаваныя. Ужо, амаль тыдзень з таго часу прайшоў. Ужо спіс якой у выніку стаў першым яго прадстаўнікі публічна выкарыстоўваюць. Гэты факт у сваёй агітацыйнай кампаніі. І ўжо можна з гэтым як заўгодна гуляцца і абыгрываць гэтую сітуацыю там жа ў кампаніі. Але, як выбарчая камісія я думаю, што мы не маем іншага рашэння акрамя як аставіць гэьае рашэнне аб лёсаванні ў сіле так сама. І не задаволіць гэтую скаргу. Прадстаўнікам спісу Пракоп’ева-Ягорава прапанаваць выкарыстоўваць іншыя магчымасці ў сваёй прамоўцыі. Мы першыя, былі першыя. Я не ведаю як, гэта не нашая справа. Але ўсё ж такі прыняць тое, што гэтае лёсаванне праводзілася, як сапраўднае і ніякіх намераў паўплываць на яго вынікі ў нас не было. Ну і ўсё на гэтым.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Алену Філатаву па пытанні скаргі ад лідара спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава” наконт лёсавання:

“Ну, насамрэч ужо ўсё сказана, мне падаецца даволі слушна даведзена. То бок прэтэнзіяў да працэдуры ў мяне няма. І я прапаную скаргу адхіліць, і пакінуць рашэнне камісіі і агучаныя вынікі ў дзеі.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Альвіну Мінгазаву па пытанні скаргі ад лідара спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава” наконт лёсавання:

“Я таксама згодна. Адмовіць у задавальненні скаргі ў сувязі з тым, што і спісы ўжо публікуюцца пад пэўнымі нумарамі, і адмена гэтага створыць вялікія праблемы.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Андрэя Атаманчука па пытанні скаргі ад лідара спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава” наконт лёсавання:

“Я таксама лічу ў выніку пакінуць бо яно ёсць, так яно і ёсць. Таму мяркую, што скаргу можна пакінуць без задавальненьня.”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні скаргі ад лідара спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава” наконт лёсавання:

“Я згодна з калегамі. І так сама па-першае гэта істотна не паўплывае станоўча, нават такая змена, а вось негатыўна акурат паўплывае. Таму, што, насамрэч ўжо спісы пачалі сваю агітацыю і рэкламуюць сябе. Зараз гэта ўнясе па-першае такую блытаніну, па-другое гэта не настолькі істотнае пытанне. І тым больш, што апроч, як ужо тут адзначылі мае калегі. Апроч скаргі ад блока Пракоп’ева-Ягорава ад іншых удзельнікаў выбараў да нас такіх пытанняў не паступала. Таму я так сама галасую за тое, каб пакінуць лёсаванне такм якім яно адбылося. І, як адзначыў Зміцер, вось гэтую тэхнічную памылку прызнаць часткай гэтага лёсавання. У тым ліку калі для кагосці гэта выглядала неяк абразліва, альбо можа на гэты конт у кагосці нарадзіліся нейкія канспіралагічныя тэорыі, то я расчарую Вас. Ніякага ўмыслу ні злога, ні яшчэ якога ў нас не было. Гэта сапраўды тэхнічная такая памылка. І я нагадаю, што мы вельмі хацелі каб па-першае увесь працэс людзі маглі назіраць. І, нагадаю, мы як ужо адзначыў Зміцер - мы ўважліва пераглядалі гэтае відэа. І там некалькі разоў у нас былі праблемы з тым, што не шарыўся экран. І мы не былі ўпэўненыя ці бачга людзям, ці не бачна. Таму вось так. Выбачайце, калі ласка калі хтосці абразіўся гэтым. Для кагосці можа гэта важна. Можа нумералогіяй займаецца, ці яшчэ чымсці, але мы пакінем нашае рашэнне без зменаў. Вялікі дзякуй, спадарства! Сення ў нас трошкі доўгае пасяджэнне атрымалася. Дзякуй вялікі ўсім, хто нас глядзеў. Нагадаю, што на любое рашэнне камісіі ў коднага з вас ёсць магчымасць абскардзіць. Я маю на ўвазе ўдзнльнікаў гэтых рашэнняў. І ўсім добрага дня! Жыве Беларусь!”

Гасасаванне за тое, каб пакінуць скаргу лідара спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава” без задавальнення, рашэнне Выбарчай камісіі па пытанні лёсавання пакінуць у сіле.
Прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Пакінуць скаргу лідара спісу “Блок Пракоф’ева-Ягорава” без задавальнення, рашэнне Выбарчай камісіі па пытанні лёсавання пакінуць у сіле.

Паседжанне абвешчана закрытым.